Источник: "Краязнаўчая газета" - 2013-01-17

# На тым тыдні...

**10 студзеня** ў Цэнтральнай навуковай бібліятэцы імя Якуба Коласа НАН Беларусі адбылося **ўрачыстае мерапрыемства, прысвечанае юбілею акадэміка НАН Беларусі Уладзіміра Гніламёдава**. У яго рамках прайшлі прэзентацыя новых выданняў вучонага, адкрыццё выстаўкі «Чалавек – сукупнасць свайго мінулага...».

**11 студзеня** ў Дзяржаўным музеі гісторыі беларускай літаратуры сумесна з Цэнтрам дадатковай адукацыі «Ветразь» зладжанае свята **«Запрашаем на Калядкі»**, дзе прадстаўлены беларускі калядны абрад, а таксама была магчымасць паўдзельнічаць у калядных гульнях.

**11 студзеня** ў Нацыянальным гістарычным музеі Рэспублікі Беларусь пачала працаваць **выстаўка «Скарбы Беларусі»**. На ёй прадстаўленыя манетныя і манетна-рэчавыя скарбы практычна ўсіх гістарычных эпох: найбуйнейшы ў краіне дэпазіт рымскіх дынарыяў III–IV стст.; скарб ювелірных упрыгожанняў VI–VII стст. з гарадзішча «Выспянская гара» і іншыя.

**11 студзеня** ў філіяле Нацыянальнага гістарычнага музея Рэспублікі Беларусь «Дом-музей I з'езда РСДРП» адкрылі выстаўку **«Народная архитектура белорусской деревни в фотографиях Владимира Шарникова»**. Выстаўка будзе працаваць да 10 лютага.

"Краязнаўчая газета". На тым тыдні...